Слука Алег

Беларускі дзяржаўны універсітэт

Новы час факультэта журналістыкі.

Рэктарат БДУ у 1967 г. прыняў рашэнне аб ператварэнні аддзялення журналістыкі у самастойны факультэт. Гэта было выклікана тым, што да сярэдзіны 60-х г. у БССР была створана разгалінаваная сістэма масавай інфармацыі: выходзіла больш 300 перыядычных выданняў, працаваў беларускі тэлерадыёкамітэт, рэспубліканскія кнігавыдавецтвы, інфармацыйнае агенцтва Белта. Для эфектыўнага функцыянавання СМІ было неабходна павялічыць падрыхтоўку прафесійных кадраў.

У 1968 г. дзённае аддзяленея факультэта закончылі толькі 23 студэнты, у той час як з 1800 журналістаў, якія працавалі ў СМІ рэспублікі, толькі 36% мелі спецыяльную адукацыю, а астатнія вучыліся у партыйнай школе пры ЦК КПБ па скарочанай праграме. ЦК КПСС у 1967 г. прыняў рашэнне аб чатырохгадовым тэрміне навучання журналістаў, але ў БДУ адбылося толькі два такіх выпускі у 1968 і 1969 г. і далейшае скарочанае навучанне было прызнана немэтазгодным.

Такім чынам, перад уноўстворыным факультэтам ставілася задача забяспечыць падрыхтоўку спецыялістаў на ўзроўні развіцця сучасных СМІ. На факультэце, які быў размешчаны ў на трэцім паверсе юрыдычннага корпуса ва ўніверсітэцкім гарадку, былі створаны новыя спецыяльныя структуры: вучоны савет, адкрыта аспірантура; сістэма кафедр для забяспячэння вучэбнага працэсу.

У 1968 г. была адкрыта кафедра радыё і тэлебачання, загадчыкам якой стаў дацэнт Дастанка М. Ё., у 1969 кафедра стылістыкі і літаратурнага рэдагавання – загадчык дацэнт Цікоцкі М. Я.; кафедра тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, якую ўзначальваў дацэнт Стральцоў Б. В. Названыя кафедры, разам з кафедрай гісторыі журналістыкі, якую ўзначальваў дацэнт Булацкі Р. В, паступова ператварыліся ў вучэбна-выхаваўчыя і навукова-метадычныя цэнтры.

Дэканам факультэта быў прызначаны дацэнт Булацкі Р. В., намеснікам дацэнт Раковіч А. І., а памочнікам Сілуянаў М. І, цудоўны чалавек, вопытны выхавацель і спрактыкаваны арганізатар моладзі. На кафедрах сабраліся майстры журналісцкай працы, якія паступова стваралі навуковую аснову навучання творчай прарфесіі. Пачалася падрыхтоўка навуковых кадраў. Першымі «абаронцамі» дысертацый сталі Раковіч А. І. 1967 г., Дастанка М. Ё., Стральцоў Б. В., Шылава Л. Ф. 1968, Арлова Т. Д., Плаўнік А. А. 1969 г.

На кафедрах выпускаліся метадычныыя дапаможнікі і вучэбныя праграмы, манаграфіі. У 1979 г. Булацкі Г. В., Говін С. В., Сачанка І. І. выдалі вучэбны дапаможнік «Гісторыя беларускай жуналістыкі», за які ім прысвоена званне лаўрэатаў прэміі Саюза журналістаў

СССР. Дацэнт А. Г. Слука за даследаванне маладзёжнага друку ў 1980 г. узнагароджаны прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі.

На кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі працавалі дацэнты Стральцоў Б. В., Бондарава Е. Л., Арлова Т. Д., В. А.,Свораб А. К., Куцэнка В. М.і інш., якія грунтоўна распрацоўвалі тэорыю і практыку журналісцкага майстэрства, тэхналогію публіцыстычных жанраў, з чаго складаецца паўсядзённая творчая праца журналістаў. Адзін з першых вучэбных дапаможнікаў Б. В.Стральцова ў 1977 г., называўся «Публіцыстыка, жанры майстэрства». За гэтым каштоўным выданнем паследавалі шматлікія манаграфіі, кнігі аб развіцці нацыянальнай журналістыкі, тэатра і кіно.

Важным звяном у справе падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў стала кафедра стылістыкі і літаратурнага рэдагавання. Загадчык кафедры дацэнт М. Я. Цікоцкі сабраў таленавітых моваведаў і стылістаў – дацэнтаў Наркевіча А. І., Грабчыкава І. М., Рудэнка А. А., Каваленка М. Р., Карповіч М. П.і інш. Яны выдалі шэраг вучэбных дапаможнікаў, праграм, беларусіх і рускіх слоўнікаў для студэнтаў. Найбольш вядомыя з іх вучэбны дапаможнік Цікоцкага М. Я. «Эстэтыка публіцыстычнага слова» і «Слоўнік беларускай мовы» С. М. Грабчыкава, якімі да сяго часу карыстаюцца студэнты інстытута журналістыкі.

Новастcovраная кафедра радыё і тэлебачання стала запатрабаваным навукова-вучэбным падраздзяленнем. Разам з вопытным радыёжурналістам і кіраўніком кафедры Дастанка М. Ё. працавалі маладыя выкладчыкі Радкевіч Я. Р., Фральцова Н. Ц., Шэін В. М. і інш.

Фактычна да сярэдзіны 70-х г. факультэт журналістыкі стаў прызнаным культурным цэнтрам рэспублікі. Паступова павялічваўся прыём студэнтаў і суадносна выпуск высокваліфікаваных спецыялістаў. Калі ў 1970 г. было падрыхтавана 70 студэнтаў, то ў 1975 г. было 120 выпускнікоў. Вучоныя факультэта ў гэты час ўзняліся на вяршыню грамадскага прызнання, пачаліся абароны доктарскіх дысертацый. Заўважым, што да 70-х г. дактароў навук на факультэце не было. У 1971 г. доктарскую дысертацыю абараніў дэкан факультэта Булацкі Р. В., Цікоцкі М. Я. у 1972, Наркевіч А. І. у 1973, Стральцоў Б. В. у 1974, Бондарава Е. Л. у 1975 г. Інтэнсіўна абаранялі кандыдацкія дысертацыі:маладыя супрацоўнікі: Сачанка І. І. – 1970 г., Слука А. Г. – 1971 г., Говін С. В. – 1972 г., Панамарова А. В., Радкевіч Я. Р., Фральцова Н. Ц., Шэін В. М. – 1974 г.

Вучэбны працэс на факультэце вялі вядомыя вучоныя універсітэта: мовазнаўца, прафесар Булахаў М. Г., гісторык, прафесар Жураў А. Я; прафесар, член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук СССР Абэцадарскі Л. С., выпускнік журфака 1949 г., Герой Савецкага Саюза прафесар Філімонаў А. А., Герой Савецкага Саюза, гісторык, прафесар Жмуроўскі Д. П., гісторык, акадэмік НАН Беларусі Ігнаценка І. М. і інш.

У 1975 г. у сувязі з будаўніцтвам мінскага метро факультэт з універсітэцкага гарадка быў пераведзены на Маскоўскую вул. 15. Расла колькасць студэнтаў і выпускнікоў, якія дзякуючы фундаментальнай адукацыі працавалі і працуюць у сферах дзяржаўнага кіравання, навукі і культуры. Выпускнікі: 1949 г. Сікорскі У. М. – рэктар БГУ; 1955 г. Бровікаў В. І. – старшыня Савета Міністраў БССР; 1968 г. Вялічка У. П. – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь, рэдактар часопіса «Беларуская думка», Марціновіч А. А. сакратар Саюза пісбменнікаў, лаўрэат дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь; 1969 г. Шыманскі М. В. – галоўны рэдактар «Народнай газеты», старшыня Аграрнай партыі Беларусі; 1971 г. Пашкоў Г. П. – вядомы паэт, галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя»; 1972 г. Заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь, рэдактар маладзечненскай раённай гзеты Хазянін А. А., Генеральны дырэктар Белта Аляксейчык Я. Я., 1974 г. Наркевіч В. Б. – галоўны рэдактар газеты «Звязда», Якубовіч П. І. – галоўны рэдактар газеты “Советская Белоруссия”, Екель Л. С.- старшыня Беларускага саюза журналістаў і мн.інш.

У 1981 г. дэканам факультэта быў прызначаны доктар філалагічных навук (працаваў на гэтай пасадзе да 1985 г.), прафесар, загадчык кафедры рускай класічнай літаратуры, выпускнік факультэта журналістыкі 1955 г., пісьменнік, Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР Ткачоў Павел Іванавіч. Асоба каларытная і творчая, ён напісаў больш 20 кніг, ведаў спецыфіку работы журнлістаў, шмат гадоў працаваў у перыядычным друку і выкладаў на журфаку і такім чынам быў знаёмы і з калектывам выкладчыкаў і з арганізацыяй вучобы і выхавання студэнтаў.

Адпаведна пастановы Міністэрства адукацыіі СССР ад 1979 г. на факультэце было адкрыта замежнае аддзяленне для студэнтаў з развіваючыхся краін. З кожным годам колькасць замежных студэнтаў узрастала. У 1980 г. іх стала 30, а ў 1981 – 35. Намеснікам дэкана была прызначана Рудэнка Ангеліна Аляксандраўна таленавіты выкладчык, вопытны арганізатар журналісцкага навучання, які чвэрць стагоддзя заставаўся на адказнай пасадзе арганізацыі высокапрафесійнай падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў.

У 1984 г. была створана кафедра замежнай журналістыкі і літаратуры, якую ўзначаліў прафесар Сачанка І. І.

На факультэце прадаўжалася абарона кандыдатскіх дысертацый. У 1981 г. абараніўся Касько У. К., у 1982 г. Яканюк Д. Л., у 1984 г. Булацкі В. Р. Тады ж абаронена тры доктарскія дысертацыі. У 1982 г. у Кіеве дацэнт Сачанка І. І., які ў той час працаваў намеснікам дэкана, у 1985 г. у Маскве загадчык кафедры радыё і тэлебачання Радкевіч Я. Р., у 1986 г.у Ленінградзе дэкан факультэта А. Г. Слука. Навуковы патэнцыял факультэта павышаўся суадносна з ростам студэнтаў факультэта. У 1980 г. на ўсіх формах навучання было 223 студэнты, а на наступны

год іх было ўжо 268. Сярод выпускнікоў многія супрацоўнікі факультэта і кіраўнікі СМІ рэспубліканскага ўзроўню.

У 1975 г. факультэт закончылі: Булацкі В. Р. загадчык кафедры радыё і тэлебачання; у 1979 – загадчык кафедры сацыялогіі журналістыкі Вараб'ёў В. П., загадчык кафедры гісторыі журналістыкі Дарашчонак П. Л., Саянкова Л. П. – загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі; рэдактар "Чырвонай змены", Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Надзвычайны і паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь у Чэшскай Рэспубліцы Бельскі У. П., намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі Саламаха А. П.; у 1982 Ананіч Л. С. – першы насемнік Міністра інфармацыі, Бялова Т. У. – кіраўнік грамадскага прэсцэнтра Дома друку; у 1984 – выкладчык факультэта Мацецкая Л. В.; у 1985 – загадчык кафедры тэхналогій камунікацыі Вашкевіч В.Р. Шэраг знакавых імён, якія ўваходзяць у каштоўны журналісцкі фонд прадаўжаецца бясконца і з кожным годам прырастае новымі талентамі.

Міністэрствам адукацыі Беларусі ў 1978 г. было прынята рашэнне размясціць частку факультэта журналістыкі ў вучэбным корпусе былога эканамічнага інстытута на вул. Свярдлова. У сярэдзіне 80-х гадоў у Рэспубліцы Беларусь пачаліся шырокія дэмакратычныя пераўтварэнні, якія паўплывалі на абнаўленне вышэйшай школы. Карэнныя змены адбыліся і на факультэце журналістыкі. У першую чаргу яны былі звязаны з удасканаленнем вучэбнага працэсу. Узначальваў факультэт журналістыкі з 1986 па 1996 г. прафесар Слука А. Г.

У 1986–1987 навучальным годзе быў распрацаваны і ўведзены новы вучэбны план, у якім былі збалансаваны грамадскія і спецыяльныя дысцыяліны, тэарэтычная частка навучання і творчая практыка, вывучэнне беларускай, рускай і замежных моў. Вучэбны план быў узгоднены ва Усесаюзным вучэбна-метадычным аб'яднанні, якое працавала на факультэце журналістыкі Маскоўскага унівесрсітэта, і праз якое былі ўстаноўлены цесныя творчыя сувязі з усімі факультэтамі журналістыкі універсітэтаў СССР.

Па рашэнню Міністэрства адукацыі СССР у 1988 г. была праведезена атэстацыя факультэта журналістыкі на прадмет прафесійнай падрыхтоўкі савецкіх і замежных студэнтаў. Камісію ўзначальваў дэкан факультэта журналістыкі Ленінградскага універсітэта прафесар Беражны А. Д. Агульны вывад камісіі быў станоўчы. Рэктарату БДУ было дазволена стварыць на факультэце самастойнае замежнае аддзяленне.

Такім чынам, факультэт журналістыкі па складу сваіх студэнтаў стаў міжнародным. Каля чатырохсот грамадзян розных краін сталі выпускнікамі факультэта і цяпер працуюць больш чым у ста краінах свету Яны стварылі факультэты журналістыкі ва універсітэтах В'етнама, Афганістана, Йемена. Каля 30 замежных грамадзян абаранілі кндыдацкія дысертацыі.

Да гэтага часу значна падрасла кагорта вядомых беларускіх журналістаў. У 1986 г. факультэт закончыла дацэнт Падаляк Т. У. публіцыст-звяздовец; у 1987 – пісьменнік, дацэнт

Драздоў Д. М. у 1989 – дацэнты Маськова Е. У. і Патрэбін А. У.; у 1993 – дацэнт Салаўёў А. І. і рэдактар газет «Аргументы и факты в Белоруссии», дацэнт Сакалоў І. М.; у 1994 – пісьменнік, дацэнт Конеў Я. Ф. і інш.

Падрыхтоўку кадраў на факультэце па заданні ЦК КПБ у 1988 г. правяраў Саюз журналістаў. Гэта быў перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху, узнікнення альтэрнатыўных Камуністычнай партыі арганізацый, і калі сталі стварацца незалежныя газеты і часопісы. На аснове матэрыялаў праверкі ЦК КПБ прыняў пастанову «Аб паляпшэнні падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў у БДУ». Выканаць пастанову рэктарат і ЦК КПБ не паспелі. Надышоў 1991 г., Рэспубліка Беларусь стала свабоднай краінай, а Камуністычная партыя была забаронена.

Рэфармаванне факультэта калектыў выкладчыкаў праводзіў сваімі сіламі. У 1988 г. была створана навукова-даследчая лабараторыя СМІ з бюджэтным фінансаваннем. ВАК СССР у маі 1991 г. зацвердзіў савет па абароне кандыдацкіх дысертацый.

У савет увайшлі дактары навук, прафесары: Бондарава Е. Л., Булацкі Р. В., Наркевіч А. І., Радкевіч Я. Р., Сачанка І. І., Слука А. Г. – старшыня савета, Стральцоў Б. В. – намеснік старшыні савета, Цікоцкі М. Я., дацэнт Вараб'ёў В. П.– сакратар савета. За чатыры гады працы савета было арганізавана 35 абарон кандыдацкіх дысертацый, у тым ліку прадстаўнікоў Ленінградскага і Кішынёўскага універсітэтаў. У гэты час абаранілі кандыдацкія дысертацыі: у 1992 г. Дабрынеўская Т. Г., у 1993 г. Белякова Л. П., Дарашчонак П. Л., у 1994 г. Вашкевіч Р. А., Маськова Е. В., у 1995 г. Драздоў Д. М.

У 1992 г. метадычны савет факультэта распрацаваў новы вучэбны план падрыхтоўкі журналістаў ва ўмовах дэмакратычнага будаўніцтва свабоднай і незалежнай Рэспублікі Бедларусь. У аснову былі пакладзены прынцыпы нацыянальнага зместу навучання студэнтаў з улікам міжнароднага вопыту. Галоўная ўвага была звернута на стварэнне спрыяльных умоў для развіцця спецыялізацый журналісцкай прафесіі: камп'ютэрны дызайн, журналіст-аналітык, міжнародная журналістыка, рэдактар рэкламы, аглядальнік на радыё і тэлебачанні, рэдактар па перакладу, рэжысёр тэлебачання і інш. Дысцыпліны спецыялізацыі, разам з выкладчыкамі факультэта, вялі найбольш вопытныя журналісты і рэдактары рэспубліканскіх выданняў, радыё і тэлебачання.

Адбыліся і арганізацыйныя змены на факультэце. У 1988 г. загадчыкам кафедры гісторыі і літаратуры быў абраны парфесар Слука А. Г., тэорыі і практыкі журналістыкі – дацэнт Вараб'ёў В. П., стылістыкі і літаратурнага рэдагавання – прафесар Наркевіч А. І.

У 1992 г. быў праведзены эксперымент падрыхтоўкі журналістаў на аснове вышэйшай адукацыі па трохгадовай праграме з выдачай дзяржаўнага дыплома. Набор здзяйсняўся на падставе субясёдавання і абавязковай умовы, працы паступаючых на факультэт у СМІ. Было

арганізавана толькі тры наборы студэнтаў па адной групе па завочнай форме навучання Па новаму палажэнню другая вышэйшая адукацыя здзяйснялася толькі на платнай аснове.

Зыходзячы з мяняючыхся ўмоў арганізацыі вышэйшай адукацыі і пастянна растучы попыт на журналіцкую прафесію, савет факультэта ў 1993 г. прыняў пастанову аб увядзенні кантрактанай формы прыёму і навучання студэнтаў. Прыём на першы курс адразу рэзка узрос. У 1994 г. было залічана 110, а ў 1995 ужо 175 студэнтаў.

Факультэт у той час пачаў нанава развіваць творчыя кантакты з факультэтамі краін СНД і еўрапейскімі універсітэтамі. У 1993 г. па праграме «Тэмпус» былі заключаны пагадненні аб супрацоўніцтве вучоных фаультэтаў журналістыкі БДУ, Марсельскага і Грэнобльскага (Францыя) і Гульскага (Вялікабрытанія) універсітэтаў. Былі арганізаваны семінары выкладчыкаў названых універсітэітаў, затым наладжаны іх ўзаемаабмен для дэталёвага вывучэння вопыту арганізацыі вучэбных заняткаў. У выніку агульнай працы была падрыхтавана аснова для адкрыцця на факультэце журналістыкі БДУ у 1996 г. новай спецыяльнасці – інфармацыя і камунікацыя.

Такім чынам, у кароткі тэрмін факультэт журналістыкі БДУ ператварыўся ў эфектыўны вучэбна-навуковы комплекс падрыхтоўкі нацыянальных кадраў для сродкаў масавай інфармацыі.